ББК 63.3 (2Б)
Г 516

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Рэцэнзенты: загадчык кафедры гісторыі Беларусі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт П.І. Брыгадзін; загадчык кафедры гісторыі Беларусі Беларускага лінгвістычнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт С.Я. Новікаў.

Пад агульнай рэдакцыяй прафесара В. М. Фаміна,
дацэнта У. В. Тугая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дапаможнік уключае ў сябе артыкулы па найбольш актуальных праблемах гісторыі Беларусі. Яго асаблівасцю з'яўляецца навуковы падыход да асвятлення разглядаемых пытанняў, імкненне выйсці за межы панаваўшых догмаў.

Прызначаецца студэнтам гістарычных факультэтаў вышэйшых педагагічных навучальных устаноў.

ISBN 985-60-87-56-2

© Калектыў аўтараў, 1994.
© *Арыгінал-макет:* А.А. Пакала, 1994.

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ І НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

**Вучэбны дапаможнік
для студэнтаў гістарычных факультэтаў**

Мінск 1994

Вучэбнае выданне

Гісторыя Беларусі

Вучэбны дапаможнік
для студэнтаў гістарычных факультэтаў

Карэктар А. В. Сідарэнка

Падпісана ў друк 13.12.94. Фармат 60×84 1/16. Папера друк. № 2.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 7,5. Ум. фарб.-адб. 8,00. Ул.-выд. арк. 6,7
Тыраж 200 экз. Заказ 1053. Цана 4500 р.

Ратапрынт БДПУ. 220809. г. Мінск, вул. Савецкая, 18.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА 3

ВАЛТЫ І СЛАВЯНЕ НА БЕЛАРУСІ (*С. А. Адамовіч, В. І. Шадыра*) 4

ПРАБЛЕМА ЎТВАРЭННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. КАНЕЦ XIII — ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIV СТ. (*А. Ф. Рацько*) 8

НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ, КУЛЬТУРЫ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ НА БЕЛАРУСІ Ў XVIII — XIX СТ. (*С. А. Адамовіч*) 18

УДЗЕЛ ТАТАРАЎ-МУСУЛЬМАН У ПАЎСТАННІ 1794 ГОДА ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ (*І. Б. Канапацкі*) 23

ХТО ПЕРАМОГ НА Р. БЯРЭЗІНЕ Ў ЛІСТАПАДЗЕ 1812 ГОДА? (*І. А. Груша*) 29

НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ДВАРАНСКАГА ЗЕМЛЕЎЛАДАННЯ НА БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX — ПАЧАТАК XX СТАГОДДЗЯ) (*А. П. Жытко*) 36

АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЯ І ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ДЛЯ ЧЫГУНАК БЕЛАРУСІ Ў 1900-1913 ГГ. (*П. А. Тупік*) 44

БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (*М. В. Цуба*) 53

АСВЯТЛЕННЕ АБАРОНЫ БЕЛАРУСКІХ ТЭРЫТОРЫЙ АД ПОЛЬСКІХ ВОЙСК У 1919 Г. У ДРУКУ БЕЛАРУСІ І ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ (*У. У. Куліцкі*) 62

ДА ПЫТАННЯ АБ УТВАРЭННІ І ДЗЕЙНАСЦІ МІНСКАГА КАМІТЭТА АБ'ЯДНАННАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РСДРП (САКАВІК — ЛІПЕНЬ 1917 Г.) (*М. Я. Сяменчык*) 67

ПАЛІТЫЧНЫЯ РЭПРЭСІІ НА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ 20-Х — 30-Я ГАДЫ (*М. К. Сакалоў*) 78

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ Ў ГАЛІНЕ НАРКАМАСВЕТЫ Ў 20-Я ГАДЫ (*У. В. Тугай, В. Ц. Ісаеў*) 87

ПОЛЬСКІЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ САВЕТЫ НА БЕЛАРУСІ (20-30-Я ГГ. XX СТ.) (*У. В. Тугай, В. М. Фамін*) 92

ФАРМІРАВАННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ ПАДРАЗДЗЯЛЕННЯЎ АРМІІ КРАЁВАЙ АКРУГІ "НАВАГРУДАК" (*С. П. Варадзін*) 96

ПРАФСАЮЗЫ БЕЛАРУСІ Ў СІСТЭМЕ САВЕЦКАГА ТАТАЛІТАРЫЗМУ Ў ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ (1945-1985) (*Ф. А. Шумскі*) 107

аб'яднаннямі, а новаўтварэннямі. Адзначаючы, што пры рассяленні славяне праглынулі шэраг усходне-балцкіх этнагруповак, увабралі ў сябе значную колькасць неславянскіх элементаў. А гэта значыць, што, дакладна кажучы, дрыгавічоў, крывічоў, радзімічаў называць славянамі ў поўнай меры не зусім правільна. Гэта былі не столькі славянскія, колькі племянныя групоўкі ці прымітыўныя народнасці. якія займалі сярэдзіннае становішча паміж першабытнымі, невядомымі нам па імёнах плямёнамі мясцовага насельніцтва ці іх саюзамі і старажытна беларускай народнасцю, былі першапачатковай ступенню на шляхах яе ўтварэння.

З цягам часу мясцовае насельніцтва ўсё больш зліваецца з новымі патокамі славян-прышэльцаў. Гэта пацягнула за сабой фарміраванне этнічнай спецыфікі заходніх груп усходнеславянскага насельніцтва XIX-XIII ст., што спрыяла ўтварэнню беларускага этнасу.

ПРАБЛЕМА ЎТВАРЭННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. КАНЕЦ XIII — ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIV СТ.

А.Ф.Грацько

Праблема ўтварэння Вялікага княства Літоўскага і месца беларускіх земляў у гэтым працэсе з'яўляецца найбольш складанай у нашай гістарыяграфіі. Адзначым, што амаль пяць стагоддзяў (з XIV па канец XVIII т.) Беларусь з'яўлялася састаўной часткай Вялікага княства Літоўскага. У гістарычных крыніцах перыяду феадалізму, як і ва ўсёй дарэвалюцыйнай літаратуры, выразы "Беларусь", "беларускі народ" сустракаюцца вельмі рэдка. Гэта тлумачыцца тым, што раней гэтыя паняцці былі недастаткова акрэслены. На пр. ягу стагоддзяў Беларуссю называлі толькі сучаснае Беларускае Падзвінне і Падняпроўе (у часы Рэчы Паспалітай ваяводствы Полацкае, Віцебскае, Мсціслаўскае, а з пачатку XIX ст. — губерні Віцебскую і Магілёўскую). Але найбольш часта Беларусь называлі Літвой таму, што ў часы існавання Вялікага княства Літоўскага Літвой называлі ўсю гэтую дзяржаву, уключаючы Беларусь, большую частку Украіны і шэраг рускіх абласцей. Таксама заўважым, што з сярэдзіны XVI ст. Маскоўская дзяржава стала прад'яўляць свае правы на беларускія і ўкраінскія землі, якія знаходзіліся ў складзе Вялікага княства Літоўскага. У сваю чаргу літоўскія феадалы сцвярджалі, што землі Беларусі і Украіны належаць законна ім Ідэолагі і таго і другога боку прапануюць свае версіі пра заваяванне Беларусі Літвой. Маскоўскі бок прапануе літаратурна-публіцыстычны твор "Сказание о князьях Владимирских",[1] дзе даводзілася, што літоўскія князі захапілі гэтыя землі па даручэнню маскоўскага князя, а потым самаўпраўна прысвоілі іх саб'е і зараз павінны вярнуць захопленае законным гаспадарам — маскоўскім

[1] *Дмитриева Р.П.* Сказание о князьях владимирских. М.; Л. 1955. С.109.

князям. Літоўскі бок прапануе "Хроніку" польскага гісторыка М.Стрыйкоўскага,[1] напісаную на аснове беларуска-літоўскага летапісання, дзе сцвярджаецца, што жамойцкія князі захапілі спустошаныя татарамі землі. Тут таксама трэба нагадаць вядомы летапіс "Хроніка Быхаўца",[2] дзе гаворыцца пра паход жамойцкіх князёў на спустошаныя Батыем беларускія землі і сцвярджаецца аб тым, што навагародскія і полацкія князі маюць жамойцкае паходжанне. Безумоўна, што навукоўцы, узяўшыя за аснову сваіх даследаванняў гэтыя крыніцы, непазбежна павінны былі паказваць гісторыю Вялікага княства Літоўскага аднабакова.

Ідучы услед за сярэдневяковымі храністамі, буйныя рускія гісторыкі канца XVIII — сярэдзіны XIX ст. В.Таціщаў, М.Карамзін, С.Салаўёў, У.Ключэўскі ў сваіх працах падыходзілі да пытання аб утварэнні Вялікага княства Літоўскага па-першае, фрагментарна, па-другое, тэндэнцыйна. У іх працах амаль адсутнічаюць уласна гісторыя Вялікага княства Літоўскага, звесткі пра яе эканамічнае і культурнае жыццё. Гісторыя Літоўскай дзяржавы разглядаецца з пункту гледжання русіфікатарскай палітыкі царызму на гэтай тэрыторыі. Падкрэсліваючы моц манархічнай улады Міндоўга, С. Салаўёў піша, што яна была такой жа небяспечнай для Маскоўскага княства з захаду, як і татары з усходу.[3] Пытанне аб утварэнні Вялікага княства Літоўскага яны разглядалі праз прызму складаных знешнепалітычных абставін для Русі, а таксама лічылі, што гэта скарысталі літоўскія феадалы і захапілі значную частку заходніх земляў.[4] Дарэчы, на думку М.Карамзіна, Стрыйкоўскі напісаў гісторыю Літвы, "...выбрав оную из летописей польских, отчасти из наших, ливонских, прусских, из песен и сказок. Мнимые древние известия о происхождении великого герцогства Литовского баснословны и явно основаны на догадках".[5]

У 30-х гадах гісторык М. Устралаў, палемізуючы з польскімі даследчыкамі, якія разглядалі Літву як польскую правінцыю і не звязвалі яе гісторыю з гісторыяй Расіі, распрацаваў сваю тэорыю паходжання Вялікага княства Літоўскага. Сутнасць яе заключаецца ў тым, што вялікі князь Гедымін злучыў у адзінае цэлае рускія княствы за Дняпром і ўтварыў новую дзяржаву. Пры Гедыміне і потым пры яго пераемніках у Вялікім княстве Літоўскім усё было рускае: вераванні, мова, грамадзянскія статуты, норавы, звычаі. Князі літоўскія нараджаліся ад

[1] *Strujkowski M.* Kronika polska, litewska, zmodzka i wszustkiej Rusi... Warszawa. 1846. cz.1,2.

[2] Хроника Быховца. М.; 1966. С.37.

[3] *Соловьёв С.М.* История России с древнейших времён. М., 1963. Т.3. С.151.

[4] *Татищев В.Н.* Разговор двух приятелей о пользе науки и училищ / Чтения в имп. Обществе истории и древностей российских. М., 1887. Кн. 1. С.138.; *Ключевский В.О.* Курс русской истории. Т.1. М.1956.

[5] *Карамзин М.Н.* История государства Российского. СПБ., 1842.

рускіх княгінь, жаніліся на рускіх княжнах, хрысціліся ў праваслаўную веру. Такім чынам, робіць вывад М.Устралаў, можна назваць Вялікае княства Літоўскае Руссю.[1]

У другой палове XIX ст. назіраецца асаблівая цікавасць рускай дваранскай гістарыяграфіі да праблемы ўваходжання Паўночна-Заходняга краю (як называлі Беларусь і Літву ў афіцыйных дакументах мінулага стагоддзя) у склад Вялікага княства Літоўскага. Гэта звязана перш за ўсё з задушэннем паўстання 1863-1864 гг. на Беларусі і Літве і палітыкай генерал-губернатара краю М.Мураўёва-вешальніка. Тагачасныя дваранскія гісторыкі даказвалі, што Беларусь была "издревле истинно русским краем". Прафесар Пецярбургскай духоўнай акадэміі М.Каяловіч (уражэнец Беларусі) лічыў беларусаў часткаю рускага народа, а праблему ўтварэння Вялікага княства Літоўскага разглядаў наступным чынам: утварэнне дзяржаўнасці на Заходняй Русі (гэта трэба разумець — на Беларусі) вельмі моцна паўплывала на суседнія літоўскія плямёны і асабліва на верхніх літоўцаў (аўкштайтаў), а таксама ніжніх (жамойтаў). Больш таго, у хуткім часе аўкштайты "пересоздавались в русских". Калі пачалася татарская навала і рускія былі прыціснуты к Літоўскім межам, Літва выкарыстала зручны момант і ўстанавіла сваю ўладу над заходнерускімі землямі. Тым больш, што пад націскам нямецкага Ордэна жмудзінам нічога не заставалася, як рухацца на паўднёвы ўсход спачатку на землі Аўкштайціі, потым Беларусі і Украіны. Так, у канцы XIII ст. Жмудзь хутка падпарадкавала сабе славянскія землі і ўтварыла Вялікае княства Літоўскае.[2]

Сваю думку па гэтаму пытанню выказвае і вядомы гісторык І.Бяляеў. Разважаючы наконт таго, што спрыяла вялікім поспехам літоўцаў у XIII-XIV ст., ён адзначае, што яны ўзялі сваю дзяржаўнасць у Полацку, які да таго панаваў над імі. Больш таго, розніцы паміж літоўцамі і рускімі амаль што не было, за выключэннем толькі мовы, рэлігіі і некаторых звычаяў. І Бяляеў звяртае ўвагу на некаторыя асаблівасці княжацкай улады літоўскіх князёў у параўнанні з уладай князёў полацкіх. Сярод гэтых асаблівасцей перш за ўсё ён вылучае тое, што літоўскія князі, у адрозненне ад полацкіх, былі заможнымі, што давала ім магчымасць быць даволі незалежнымі ад мясцовых улад. Улада князёў у Літве калі і была абмежавана, дык толькі не з боку народа (як гэта было ў Полацку), а з боку такіх жа буйных землеўладальнікаў, як і сам князь.[3]

Выдадзеная ў 1890 годзе пад кіраўніцтвам міністэрства ўнутраных

---

[1] *Устрялов Н.* Исследование вопроса, какое место в русской истории должно занимать Великое княжество Литовское / Русская история Ч.1. СПРб., 1838. С.434-446.

[2] *Коялович М.* Лекции по истории Западной России.. СПб., 1884. С.92-100.

[3] *Беляев И.Д.* История Полоцка или Северо-Западной Руси от древнейших времен до Люблинской унии. Ч.1. Строй жизни Полоцка и Великого княжества Литовского. М., 1872.

спраў і пры ўдзеле прафесара Кіеўскай духоўнай акадэміі праца "Беларусь і Літва".[1] нібыта падсумоўвае тое, што было напісана па праблеме ўтварэння і ўмацавання Вялікага княства Літоўскага. У XIII ст. літоўскія плямёны, якіх з поўначы і з паўночнага захаду прыціскалі нямецкія ордэны (Лівонскі і Тэўтонскі), з поўдня — палякі і з паўднёвага захаду — рускія славяне, пачынаюць аб'ядноўваць у адзіную дзяржаву і падпарадкоўваць сваёй уладзе суседнія славянскія плямёны, якія былі аслаблены к таму часу падзелам рускай дзяржавы на ўдзелы і татарскай навалай. Літоўскія князі аб'ядналіся пад началам Міндоўга, які пры дапамозе Літвы ўтрымліваў і набываў рускія землі, а, абапіраючыся на падпарадкаванне сваіх рускіх абласцей, падпарадкоўваў сабе разрозненыя мелкія літоўскія ўладанні.

Такой была афіцыйная гістарыяграфія, якая па сутнасці не вяла самастойнай распрацоўкі гісторыі Вялікага княства Літоўскага, не клапацілася аб якой-небудзь аргументацыі.

Значна адрозніваюцца ў гэтым сэнсе спецыяльныя навуковыя даследаванні такіх вядомых вучоных, як Б.Антановіч, М.Дашкевіч, А.Прэснякоў, К.Любаўскі. Гэтыя гісторыкі чэрпалі ў асноўным матэрыялы для сваіх даследаванняў у працы Т.Нарбута "Дзеі старажытнага народу Літоўскага", дзе дасціпна палеаграфічнае апісанне хронікі Быхаўца, а таксама з "Хронікі" М.Стрыйкоўскага. Аўтары, тым не менш, прааналізаваўшы і шэраг іншых крыніц, адзначылі вельмі важныя асаблівасці, якія праўдзіва характарызавалі як працэс утварэння Вялікага княства Літоўскага, так і ўсю гісторыю гэтай дзяржавы.

У сваіх працах[2] Б.Антановіч сцвярджае, што да XIV стагоддзя літоўскія землі ўяўлялі сабой масу невялікіх воласцей, якія кіраваліся незалежнымі князямі. Манархіі не было. Тое, што аб'ядноўвала іх, — гэта этнаграфічная і культурная агульнасць. Як жа адбылося аб'яднанне ў адзіную моцную дзяржаву? Тут галоўную ролю адыгрываў знешні фактар. Небяспека з боку немцаў падштурхоўвала літоўцаў да хуткага аб'яднання. Тое, што Літоўскае княства ўтвараецца на рускіх землях (маюцца на ўвазе беларускія землі Навагародка і Чорнай Русі), гаворыць яшчэ пра адзін знешні фактар — рускі, бо менавіта на рускай зямлі Міндоўг бярэ сілы, каб умацаваць сваю ўладу ў Літве і нападварот, у Літве — каб наступаць на Русь. Далей Б.Антановіч распрацоўвае канцэпцыю этнічнай барацьбы паміж літоўцамі і рускімі на этапе ўтварэння Вялікага княства Літоўскага, якая была вельмі небяспечнай для новай дзяржавы. Ён піша, што пасля Міндоўга літоўцы паспрабавалі абапірацца ў сваёй палітыцы выключна на свой літоўскі этнас, язычніцтва, адасобленасць сялян-земляў, непрыняцце праваслаўнага хрысціянства. Гэта прывяло да страты падтрымкі з боку

---

[1] Белоруссия и Литва. Изд. П.Н.Батюшкова. СПб., 1890.

[2] *Антонович Б.В.* Монографии по истории Западной и Юго-Западной России. Т.1. Киев. 1885. Ён жа. Очерк истории Великого княжества Литовского. Тернополь. 1887.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рускіх княгінь, жаніліся на рускіх княжнах, хрысціліся ў праваслаўную веру. Такім чынам, робіць вывад М.Устралаў, можна назваць Вялікае княства Літоўскае Руссю.[1]

У другой палове XIX ст. назіраецца асаблівая цікавасць рускай дваранскай гістарыяграфіі да праблемы ўваходжання Паўночна-Заходняга краю (як называлі Беларусь і Літву ў афіцыйных дакументах мінулага стагоддзя) у склад Вялікага княства Літоўскага. Гэта звязана перш за ўсё з задушэннем паўстання 1863-1864 гг. на Беларусі і Літве і палітыкай генерал-губернатара краю М.Мураўёва-вешальніка. Тагачасныя дваранскія гісторыкі даказвалі, што Беларусь была "издревле истинно русским краем". Прафесар Пецярбургскай духоўнай акадэміі М.Каяловіч (уражэнец Беларусі) лічыў беларусаў часткаю рускага народа, а праблему ўтварэння Вялікага княства Літоўскага разглядаў наступным чынам: утварэнне дзяржаўнасці на Заходняй Русі (гэта трэба разумець — на Беларусі) вельмі моцна паўплывала на суседнія літоўскія плямёны і асабліва на верхніх літоўцаў (аўкштайтаў), а таксама ніжніх (жамойтаў). Больш таго, у хуткім часе аўкштайты "пересоздавались в русских". Калі пачалася татарская навала і рускія былі прыціснуты к Літоўскім межам, Літва выкарыстала зручны момант і ўстанавіла сваю ўладу над заходнерускімі землямі. Тым больш, што пад націскам нямецкага Ордэна жмудзінам нічога не заставалася, як рухацца на паўднёвы ўсход спачатку на землі Аўкштайціі, потым Беларусі і Украіны. Так, у канцы XIII ст. Жмудзь хутка падпарадкавала сабе славянскія землі і ўтварыла Вялікае княства Літоўскае.[2]

Сваю думку па гэтаму пытанню выказвае і вядомы гісторык І.Бяляеў. Разважаючы наконт таго, што спрыяла вялікім поспехам літоўцаў у XIII-XIV ст., ён адзначае, што яны ўзялі сваю дзяржаўнасць у Полацку, які да таго панаваў над імі. Больш таго, розніцы паміж літоўцамі і рускімі амаль што не было, за выключэннем толькі мовы, рэлігіі і некаторых звычаяў. І Бяляеў звяртае ўвагу на некаторыя асаблівасці княжацкай улады літоўскіх князёў у параўнанні з уладай князёў полацкіх. Сярод гэтых асаблівасцей перш за ўсё ён вылучае тое, што літоўскія князі, у адрозненне ад полацкіх, былі заможнымі, што давала ім магчымасць быць даволі незалежнымі ад мясцовых улад. Улада князёў у Літве калі і была абмежавана, дык толькі не з боку народа (як гэта было ў Полацку), а з боку такіх жа буйных землеўладальнікаў, як і сам князь.[3]

Выдадзеная ў 1890 годзе пад кіраўніцтвам міністэрства ўнутраных

---

[1] *Устрялов Н.* Исследование вопроса, какое место в русской истории должно занимать Великое княжество Литовское / Русская история Ч.1. СПб., 1838. С.434-446.

[2] *Коялович М.* Лекции по истории Западной России.. СПб., 1884. С.92-100.

[3] *Беляев И.Д.* История Полоцка или Северо-Западной Руси от древнейших времен до Люблинской унии. Ч.1. Строй жизни Полоцка и Великого княжества Литовского. М., 1872.

спраў і пры ўдзеле прафесара Кіеўскай духоўнай акадэміі праца "Беларусь і Літва".[1] нібыта падсумоўвае тое, што было напісана па праблеме ўтварэння і ўмацавання Вялікага княства Літоўскага. У XIII ст. літоўскія плямёны, якіх з поўначы і з паўночнага захаду прыціскалі нямецкія ордэны (Лівонскі і Тэўтонскі), з поўдня — палякі і з паўднёвага захаду — рускія славяне, пачынаюць аб'ядноўваць у адзіную дзяржаву і падпарадкоўваць сваёй уладзе суседнія славянскія плямёны, якія былі аслаблены к таму часу падзелам рускай дзяржавы на ўдзелы і татарскай навалай. Літоўскія князі аб'ядналіся пад началам Міндоўга, які пры дапамозе Літвы ўтрымліваў і набываў рускія землі, а, абапіраючыся на апалчэнне сваіх рускіх абласцей, падпарадкоўваў сабе разрозненыя мелкія літоўскія ўладанні.

Такой была афіцыйная гістарыяграфія, якая па сутнасці не вяла самастойнай распрацоўкі гісторыі Вялікага княства Літоўскага, не клапацілася аб якой-небудзь аргументацыі.

Значна адрозніваюцца ў гэтым сэнсе спецыяльныя навуковыя даследаванні такіх вядомых вучоных, як Б.Антановіч, М.Дашкевіч, А.Прэснякоў, К.Любаўскі. Гэтыя гісторыкі чэрпалі ў асноўным матэрыялы для сваіх даследаванняў у працы Т.Нарбута "Дзеі старажытныя народу Літоўскага", дзе даецца палеаграфічнае апісанне хронікі Быхаўца, а таксама з "Хронікі" М.Стрыйкоўскага. Аўтары, тым не менш, прааналізаваўшы і шэраг іншых крыніц, адзначылі вельмі важныя асаблівасці, якія праўдзіва характарызавалі як працэс утварэння Вялікага княства Літоўскага, так і ўсю гісторыю гэтай дзяржавы.

У сваіх працах[2] Б.Антановіч сцвярджае, што да XIV стагоддзя літоўскія землі ўяўлялі сабой масу невялікіх валасцей, якія кіраваліся незалежнымі князямі. Манархіі не было. Тое, што аб'ядноўвала іх, — гэта этнаграфічная і культурная агульнасць. Як жа адбылося аб'яднанне ў адзіную моцную дзяржаву? Тут галоўную ролю адыгрываў знешні фактар. Небяспека з боку немцаў падштурхоўвала літоўцаў да хуткага аб'яднання. Тое, што Літоўскае княства ўтвараецца на рускіх землях (маюцца на ўвазе беларускія землі Навагародска і Чорнай Русі), гаворыць яшчэ пра адзін знешні фактар — рускі, бо менавіта на рускай зямлі Міндоўг бярэ сілы, каб умацаваць сваю ўладу ў Літве і наадварот, у Літве — каб наступаць на Русь. Далей Б.Антановіч распрацоўвае канцэпцыю этнічнай барацьбы паміж літоўцамі і рускімі на этапе ўтварэння Вялікага княства Літоўскага, якая была вельмі небяспечнай для новай дзяржавы. Ён піша, што пасля Міндоўга літоўцы паспрабавалі абапірацца ў сваёй палітыцы выключна на свой літоўскі этнас, язычніцтва, адасобленасць сялях земляў, непрыняцце праваслаўнага хрысціянства. Гэта прывяло да страты падтрымкі з боку

---

[1] Белоруссия и Литва. Изд. П.Н.Батюшкова. СПб., 1890.

[2] *Антонович Б.В.* Монографии по истории Западной и Юго-Западной России. Т.1. Киев. 1885. Ён жа. Очерк истории Великого княжества Литовского. Тернополь. 1887.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ

славянскіх земляў і пашырыла пагрозу страты незалежнасці саміх літоўцаў. Памылку выправілі Віцень і Гедымін. Менавіта яны адмаўляюцца ад перавагі літоўскага элемента і ўцягваюць рускія сілы, ствараюць асноўны цэнтр сваёй дзяржавы на славянскай тэрыторыі.

Аналізуючы праблему ўтварэння Вялікага княства Літоўскага, гісторык М.Дашкевіч[1] звяртае ўвагу перш за ўсё на этнічныя працэсы і знешнепалітычныя абставіны. Але ў адрозненне ад Б.Антановіча ён лічыць, што барацьба літоўскага і рускага этнасу, якая сапраўды мела месца ў Літве, разгарнулася шырока толькі пасля Крэўскай уніі. Да 1386 года тут не было ніякай этнічнай барацьбы, што, дарэчы, з'яўляецца адной з прычын хуткага ўтварэння і ўмацавання Вялікага княства Літоўскага. Да таго ж, ён звяртае ўвагу на тое, што Літва прызнала палітычнае і рэлігійнае раўнапраўе славянскага насельніцтва з літоўскім, на ўзаемапранікненне літоўскага і славянскага этнасаў. М.Дашкевіч пісаў, што літоўскае племя прыдавала маладому дзяржаўнаму арганізму заваяльную энергію, што літоўцы вялі ў асноўным барацьбу з немцамі, а вось рускае, славянскае племя падмацоўвала літоўцаў матэрыяльна, таксама прынесла ім сваю культуру. Менавіта пад уплывам Русі на Літве ўмацаваўся прынцып радавога старшынства князёў у адрозненне ад польскай традыцыі спадчыннага ўладання невялікакняскага дома абласцямі і гарадамі. М.Дашкевіч мяркуе, што сярод літоўскіх радоў тыя, што знаходзіліся каля прымор'я і рэк, былі на больш высокім узроўні культурнага жыцця. Гарады ў Літве ўзнікалі ў першай палове XIII стагоддзя. На думку даследчыка, у гэты час у літоўскіх землях было нешта накшталт федэрацыі, у якую ўваходзілі Літва і Жмудзь. Пастаянныя сутыкненні з крыжакамі выпрацавалі ў літоўцаў "дружынны лад", які потым і прывёў да ўтварэння дзяржаўнасці. З'яўляецца, як заўважае гісторык, у Літве і вышэйшы клас насельніцтва — князі. Ну, а тут ужо недалёка і да дзяржавы.

Праблему ўтварэння Вялікага княства Літоўскага разглядаў таксама вядомы дасавецкі даследчык А.Прэснякоў. Ён у сваіх нарысах па гісторыі XIII-XV ст.[2] выказвае думку, што актыўныя выступленні літоўцаў у другой палове XII ст. сведчаць пра тое, што мог узнікнуць своеасаблівы саюз дробных княскіх сіл пад кіраўніцтвам часовай ці пастаяннай вялікакняскай улады. Як і папярэднія даследчыкі, А.Прэснякоў сцвярджае, што Міндоўг стварае сваю дзяржаву, успрыняўшы славянскія традыцыі, культуру, арганізацыю і г.д. Славяне ж прызналі літоўскую ўладу і падтрымалі вялікага князя. Аўтар падкрэслівае і той факт, што Міндоўг стварае сваю дзяржаву не на літоўскіх, а на славянскіх землях.

Пытанне аб узнікненні Вялікага княства Літоўскага разглядаў і

---

[1] *Дашкевич Н.П.* Записки по истории Литовско-русского государства. Киев. 1885.

[2] *Пресняков А.Е.* Образование Великорусского государства. Очерки по истории XIII-XV столетий. СПб., 1918.

буйны гісторык К.Любаўскі. На першае месца, як і іншыя даследчыкі, К.Любаўскі[1], ставіць знешні фактар. Менавіта знешняя пагроза прымусіла літоўскіх князёў аб'яднацца пад уладай Міндоўга, які потым і ўтварыў Літоўскую дзяржаву. Далей ён звяртае ўвагу на палітычную раздробленасць Заходняй Русі, на страту гэтымі землямі палітычнага цэнтра, вакол якога маглі б групавацца іх палітычныя сілы.

Падсумоўваючы погляды дасавецкіх гісторыкаў на праблему ўтварэння Вялікага княства Літоўскага, мы заўважаем некаторыя асноўныя моманты, якія трывала ўмацаваліся ў гістарыяграфіі савецкага часу. Па-першае, гэта так званы "знешні фактар" — барацьба рускіх земляў з мангола-татарскімі і нямецкімі нападнікамі. Па-другое, раздробленасць земляў Заходняй Русі і адсутнасць тут той моцнай сілы, якая б магла аб'яднаць гэтыя тэрыторыі ў адну дзяржаву. Па-трэцяе, гэта захоп літоўскімі феадаламі начале з Міндоўгам беларускіх земляў на верхнім Нёмане як пачатак утварэння літоўскай дзяржавы. Амаль ніхто не піша аб тым, што ўваходжанне усходнеславянскіх, а фактычна, беларускіх земляў у склад Вялікага княства Літоўскага было выпікам кампраміса, пагаднення літоўскіх князёў з мясцовым баярствам і гарадамі.

У савецкай гістарыяграфіі пытанне аб утварэнні Вялікага княства Літоўскага не было перагледжана. Нават такія гісторыкі, як В. Ластоўскі і У. Ігнатоўскі, ў сваіх працах[2], ідучы за традыцыйнай рускай дваранскай гістарыяграфіяй, пісалі аб захопе беларускіх земляў літоўскімі феадаламі начале з Міндоўгам. Аднак, у адрозненне ад папярэдніх даследчыкаў В.Ігнатоўскі называе Вялікае княства Літоўскае Літоўска-Беларускай дзяржавай, начале якой стаіць гаспадар — вялікі князь-літвін, а пануюць культура Полаччыны, беларуская мова, якая стала дзяржаўнай. У Літоўска-Беларускім гаспадарстве згодна жывуць дзве веры: усходнехрысціянская — у славян, і паганская — у літвінаў. У.Ігнатоўскі быў першым з беларускіх гісторыкаў, хто даў правільную назву Вялікаму княству Літоўскаму, характарызуючы яе нацыянальны характар. Аднак у кнізе В.Ластоўскага "Кароткая гісторыя Беларусі" гэтая дзяржава названа паводле традыцыі рускіх дваранскіх і буржуазных гісторыкаў Літоўска-Рускай дзяржавай.

У канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў гістарычная навука апынулася пад моцным ціскам сталінскай знешняй палітыкі. У тыя часы Літва і Польшча былі буржуазнымі, а значыць, — варожымі дзяржавамі. Гісторыкам трэба было прытрымлівацца прынцыпу: "История — это политика, опрокинутая в прошлое" і даказваць спадзечную варожасць

---

[1] *Любавский М.К.* Очерк истории Литовско-русского государства до Люблинской унии включительно. М., 1910.

[2] *Ластоўскі В.* Кароткая гісторыя Беларусі. Вільня. 1910; Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1919.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ

гэтых дзяржаў да беларускага і рускага народаў.[1] А раз Літва — вераг, значыць неабходна перагледзець і гісторыю адносін з Літвой. Ну а тут, паводле Сталіна, можна грэбаваць сапраўднасцю, тут прынцыпы важней за факты. У гістарычнай навуцы замацоўваюцца палажэнні аб спадвечнай варожасці да Літвы і Польшчы. Таму ў вядомых "Тэзісах" аб асноўных пытаннях гісторыі БССР з'яўляецца раздзел "Беларусь пад уладай літоўскіх і польскіх захопнікаў XIV-XVIII ст."[2] Такім чынам, у 40-х — першай палове 50-х гадоў ствараецца канцэпцыя гісторыі Беларусі, якая не базіруецца на грунтоўных даследаваннях і аналізе шматлікага дакументальнага матэрыялу, а на суб'ектыўных меркаваннях і домыслах. Паводле яе, Вялікае княства Літоўскае разглядаецца толькі як дзяржава літоўскіх феадалаў, прычым усяляк падкрэсліваецца захоп літоўцамі беларускіх земляў і барацьба працоўных Беларусі за ўз'яднанне з Масквою. Літоўская дзяржава, паводле схемы гісторыкаў сталінскай школы, была для беларуса, чужароднай прыгнятальнай дзяржавай. Беларускі народ у час утварэння і потым умацавання Вялікага княства Літоўскага ў афіцыйнай гістарыяграфіі паказваўся непаўнацэннай істотай, якая не магла цвёрда стаяць на ўласных нагах, не мела нічога свайго ў сваёй тысячагадовай гісторыі і марыла толькі аб адным: як бы ўз'яднацца з Масквою.

Менавіта такія падыходы да разглядаемай праблемы, а таксама да гісторыі Беларусі ў складзе Вялікага княства Літоўскага мы назіраем у працах У.Пашуты і Л.Абэцэдарскага,[3] у якіх Беларусь выступае не інакш як "падуладная Літве", "заваяваная Літвой" і г.д. Асноўныя палажэнні гэтай канцэпцыі захаваліся ў энцыклапедыях і ў фундаментальных гістарычных даследаваннях.[4]

У апошнія дзесяцігоддзі, у часы так званага застою, гісторыкі працягвалі вывучаць гісторыю і матэрыяльную культуру старажытна-беларускіх земляў, якія ў канцы XIII — пачатку XIV ст. увайшлі ў склад Вялікага княства Літоўскага. Сярод тых, хто праводзіў тады і праводзіць зараз значную працу, неабходна адзначыць расійскіх даследчыкаў М.Улашчыка, В.Сядова, Л.Аляксеева, Ф.Гурэвіч і інш. і беларускіх Г.Штыхава, А.Грыцкевіча, П.Лойка, П.Лысенка, М.Ткачова, В.Насевіча і многіх другіх.

Вельмі шмат для вывучэння першапачатковай гісторыі нашай

[1] З гісторыяй на "Вы". Мн., 1991. С7 38-39.

[2] Тэзісы аб асноўных пытаннях гісторыі БССР // Бальшавік Беларусі. № 8. 1948.

[3] *Пашуто В.Т.* Образование Литовского государства. М., 1959; Абэцэдарскі Л. У святле неабвержаных фактаў. Мн., 1969.

[4] Советская историческая энциклопедия. М., 1963. Т. 3. С. 246; Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Т.1. Мн., 1971; Гісторыя Беларускай ССР. Мн., 1972. Т.1. С. 125-126; История Европы. Т.2. М., 1992. С. 432.

бацькаўшчыны зрабіў беларускі даследчык М.Ермаловіч. Яго працы[1] на сённяшні дзень з'яўляюцца бадай што самымі папулярнымі. Даследаваўчы праблему ўтварэння Вялікага княства Літоўскага, М.Ермаловіч прыходзіць да высновы, што ніводная гістарычная крыніца не падцвярджае літоўскага заваявання Чорнай Русі і іншых беларускіх земляў, што нібыта і паклала пачатак утварэнню Літоўскай дзяржавы. Заваяванне беларусаў літоўцамі ёсць нішто іншае, як міф, які ўзнік у сярэдзіне XVI ст., каб ідэалагічна абгрунтаваць правы Маскоўскай дзяржавы на беларускія землі, значная частка якіх тады часова была занята войскамі Івана Грознага. Нельга таксама атаясамліваць летапісную Літву з усходняй часткай сучаснай Літвы. Гістарычныя сведчанні і тапачміка паказваюць, што пад уласна Літвой у XI-XIII ст. разумелася тэрыторыя Верхняга Панямоння, якая знаходзілася паміж Полацкай, Турава-Пінскай і Навагародскай землямі і якая побач з імі з'яўлялася адной з гістарычных абласцей Беларусі. Менавіта яна і была далучана да Навагародка спачатку ў 50-х гадах літоўскім перабежчыкам Міндоўгам, а пасля, у 60-х гадах, — канчаткова яго сынам Войшалкам. Навагародак стаў першай сталіцай Вялікага княства Літоўскага. Адсюль, з Беларускага Панямоння, дзе знаходзілася летапісная Літва, і пайшла назва новай дзяржавы як літоўскай. Адбываўся аб'ектыўны працэс аб'яднання беларускіх земляў, які быў у інтарэсах беларускіх феадалаў, што і характарызуе гэту дзяржаву як найперш беларускую. Вось чаму ў Вялікім княстве Літоўскім пануючае месца займае беларуская культура і дзяржаўнай стала беларуская мова.[2]

У апошнія часы ў выніку шматлікіх дыскусій і "круглых сталоў" большасць даследчыкаў прыходзіць да высновы, што ва ўмовах барацьбы з крыжацкай агрэсіяй і пад пагрозай мангола-татарскага нашэсця ў першай палове XIII стагоддзя ў Верхнім Панямонні ўзнікла беларуска-літоўскае гаспадарства з цэнтрам у Навагародку, яно і стала ядром магутнай еўрапейскай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага. Да сярэдзіны XV ст. тэрмін "Літва" адносіўся да тэрыторыі Верхняга і Сярэдняга Панямоння, а над "Руссю" разумелася Верхняе Падзвінне і Падняпроўе; сучасныя заходнія этнічналітоўскія землі (Жмудзь) канчаткова далучыліся да Вялікага княства Літоўскага ў першай палове XV ст. Вялікае княства Літоўскае ўяўляла сабой федэрацыю земляў. Гістарычныя спадкаемцы гэтай дзяржавы — усе народы, якія прымалі ўдзел у яе палітычным, культурным і эканамічным жыцці, але найперш — беларускі і літоўскі, таму будзе правільным ужываць для вызначэння дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага тэрмін Беларуска-Літоўскае гаспадарства.[3]

[1] *Ермаловіч М.І.* Па слядах аднаго міфа. Мн., 1991. Ён жа. Старажытная Беларусь. Мн., 1990.

[2] *Ермаловіч М.І.* Па слядах міфа. Мн., 1991. С.782-84.

[3] Беларуская ідэя і Вялікае княства Літоўскае // Беларуская думка. № 10. 1992. С.72.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

Падсумоўваючы вынікі гэтага кароткага гістарыяграфічнага агляду, трэба сказаць, што і на сённяшні дзень у нас няма яснага і адназначнага адказу на тое, як утварылася і набірала моц Вялікае княства Літоўскае. Але можа гэта і добра, што няма, як гэта было да нядаўняга часу, агульнага адзінства. Гісторыя — гэта навука, дзе ёсць сутыкненне і нават барацьба поў іх поглядаў. Гэта звычайна дае станоўчы вынік, будзіць розум усё новых, у тым ліку і маладых даследчыкаў.

НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ, КУЛЬТУРЫ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ НА БЕЛАРУСІ Ў XVIII — XIX СТ.

На развіццё асветы і культуры ў XVIII ст. наклалі адбітак пад ві, звязаныя з Паўночнай вайной. За час вайны Беларусь была знясілена эканамічна і духоўна. Існуючая ідэалогія адмоўна ўплывала на асвету. Так, напрыклад, у 1733 г. гродзенская шляхта давала наказ сваім паслам на Варшаўскі сейм "хадайнічаць аб выданні цвёрдага закону, каб нікога з сялянскіх дзяцей не прымалі ў школы для навучання грамаце", оо, згодна старой прымаўцы, сялянскі род добры, калі ён у маркоце, але дрэнны, калі ён у рызасці ці калі адукаваны школьнымі навукамі[1]. А менавіта гэта асяроддзе беражліва захоўвала родную мову, нацыянальныя традыцыі.

У сярэдзіне стагоддзя адукацыі надаецца больш увагі. Яна становіцца больш адкрытай для грамадства, больш свецкай. Гэтаму спрыяла праведзеная рэформа школ. Значнае месца займаюць грамадска-этычныя і прыродазнаўчыя навукі, захоўваюцца разумовыя здольнасці вучняў. У школах ствараюцца фізічныя кабінеты, у якіх робяцца доследы, праводзяцца дыспуты і г. д. На дасягненні рэформы абапіраліся дзеячы створанай у 1723 г. Адукацыйнай камісіі, якая адкрыла на тэрыторыі Беларусі 20 школ.

Навуковым цэнтрам становіцца Віленская акадэмія. Значную ролю адыгрывае Гродзенская медыцынская школа, заснаваная Антонізм Тызенгаўзам. У школе б лі абсталяваны прыродазнаўчы кабінет, аптэка, батанічны сад. У 1781 г. выйшла фундаментальная праца Тызенгаўза "Літоўская флора".

Развіццё прыродазнаўчых навук зрабіла ўплыў на філасофаў, якія ўжо абапіраліся на ідэі рацыяналізму, дасягненні фізікі, астраноміі (А. Скарульскі, С. Шадурскі, Б. Дабшэвіч, К. Нарбут).

Актыўна распаўсюджваліся творы польскіх, рускіх і заходнееўрапейскіх асветнікаў С. Сташыца, Г. Калантая, Я. Казельскага, А. Радзішчава, Ж.-Ж. Русо, Ф. Вальтэра, Р. Дэкарта, Д. Лока. У 1776-1780 гадах° выходзіць першае на беларускай зямлі перыядычнае выданне

[1]Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. Мн., 1960. С. 466–467.

"Газета Гродзенска". Літаратура Беларусі XVIII ст. адзначаецца шматмоўнасцю. Тут друкаваліся кнігі на польскай, французскай, лацінскай, італьянскай, нямецкай, яўрэйскай і латышскай мовах. Значная колькасць кніг распаўсюджвалася на Беларусь з Варшавы і Вільні. Жыццёвы шлях большасці польскіх пісьменнікаў быў звязаны з Беларуссю[1]. Тут жылі і працавалі Ф. Карпінскі, М. Дудзінскі, Я. Ясінскі. Ураджэнцамі беларускага краю былі пачынальнік польскага класіцызму Ю. Нямцэвіч, паэт і гісторык А. Нарушэвіч, драматург Ф. Багамолец, роданачальнік польскага сентыменталізму Ф. Князьнін.

Цяжкасці развіцця нацыянальнай літаратуры былі звязаны з адсутнасцю беларускіх выдавецтваў. Але тым не менш яна выжывала і востра рэагавала на тагачасныя падзеі ў палітычных сатырах "Указ гарачы", "Праект", "Песня руская" і інш. У 1794 г. з'явілася "Песня беларускіх жаўнераў" — першае ў беларускай літаратуры непасрэднае звяртанне да народа з заклікам змагацца з царызмам.

Камедыйная плынь нездарма з'яўляецца асноўным напрамкам беларускай літаратуры. Эстэтыка класіцызму дапускала выкарыстанне беларускай мовы як гутарковай ў "нізкіх" — камедыйных — жанрах, і гэты "дазвол" беларуская літаратура выкарыстоўвала. У такім жанры з'явілася і першая шматактная беларуская "Камедыя" (1787 г.) К. Марашэўскага, пастаўленая на сцэне тэатра Забельскай дамініканскай калегіі.

Развіццё беларускай літаратуры ў другой палове XVIII ст. сведчыць, што ніякі ўціск не мог яе знішчыць. Моцныя карані ў спалучэнні з заходнееўрапейскімі ўплывамі толькі ўзбагацілі яе. У канцы стагоддзя ўсё больш зараджаецца цікавасць да народнага жыцця, фальклору. Са сцвярджэннем чалавечай годнасці была звязана дэмакратычная плынь культуры Беларусі, якая яскрава праявілася і дала плённыя вынікі ў XIX стагоддзі.

Значную ролю ў культурным жыцці адыгрывала Нясвіжская бібліятэка Радзівілаў, бібліятэкі Сапегаў, Храповіча. Сярод магнатаў працвітала мецэнацтва. Іх сядзібы станавіліся сапраўднымі культурнымі цэнтрамі. Самым значным, безумоўна, быў Нясвіж. Таксама трэба назваць двары Сапегаў у Ружанах, Тызенгаўза ў Гродне, Браніцкага ў Беластоку, Агінскага ў Слоніме.

Адна з характэрных прыкмет дадзенай эпохі — масавае ўзнікненне прыватных аркестраў, капэл, тэатраў, росквіт музычнага і кампазітарскага аматарства ў вышэйшых слаях грамадства.[2] Акрамя прафесійных музыкантаў, значную большасць музыкантаў і акцёраў складалі мясцовыя жыхары. У 1776 г. у Слоніме ўжо быў вялікі ансамбль з 53 музыкантаў, у

[1]Мальдзіс А.І. На скрыжаванні славянскіх уплываў. Мн., 1980. С. 256-257.

[2]Гісторыя Беларускага тэатра. Т. 1. Мн., 1983. С. 177-224.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ